№ 9 верасень 2011 г.

*О, Беларусь, мая шыпшына,*
*Зялёны ліст, чырвоны цвет!*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш.*
***Ул. Дубоўка***

# Шыпшына

**Бюлетэнь Пастаўскай раённай арганізацыі**
**Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны**

***"І ўсё мілагучна для слыху майго: і звонкае "дзе", і густое "чаго"*** ***Пімен Панчанка***



## У НУМАРЫ:

**с. 2. - Нашы навіны пра беларускія справы**



**с.3-4. - Краязнаўчая экспедыцыя раённай арганізацыі ТБМ у матэрыяле Ігара Пракаповіча «Сонечная вандроўка»**



**с.5-6. - Выхаванне асобы і патрыёта Беларусі на аснове беларускасці і хрысціянскіх каштоўнасцяў у артыкуле Наталлі Пракаповіч**



**с. 7. - Паэтычная старонка з Мікалаем Арэхам, краязнаўцам з Гуты, з нагоды юбілею**



**с. 8. - Асаблівасці беларускай лаянкі ў матэрыяле Людмілы Сяменас «Каб цябе ліха...»**

# НАШЫ НАВІНЫ

***

## Звяртаемся да ўсіх уладаў па-беларуску

*Зварот Сакратарыяту ТБМ*

Паважаныя сябры і прыхільнікі беларускага слова!

У выніку нашых шматгадовых намаганняў у ліпені гэтага года быў прыняты закон "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб", у якім у артыкуле 18 замацавана права грамадзян атрымаць адказ на мове звароту.

Такім чынам, мы з вамі можам значна пашырыць ужыванне беларускай мовы сярод чынавенства розных узроўняў. У сувязі з гэтым заклікаем вас звяртацца ва ўсе дзяржаўныя інстанцыі толькі па-беларуску. Гэта будзе спрыяць пашырэнню нашай мовы ў дзяржаўных структурах.

*Прыняты на пасяджэнні Сакрытарыяту ТБМ*
*30 жніўня 2011 года*

***

24 верасня на сядзібе ТБМ у Мінску адбудзеца чарговая VIII справаздачна-выбарчыя асамблея РГА "Таварыства беларускай школы" і нацыянальная канферэнцыя "Пострэформенны стан беларускай адукацыі".

***

Сёлета, 19 верасня адзначаюцца дваццатыя ўгодкі дзяржаўнасці беларускай гістарычнай сімволікі: герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг. У 1991 годзе Вярхоўны Савет Беларусі XII склікання зацвердзіў сімвалы новай суверэннай дзяржавы, якая была адроджана 25 жніўня 1991 года. Вытокі нашай нацыянальнай сімволікі прасочваюцца ў часах глыбокай даўніны. Так, герб "Пагоня" выкарыстоўваўся на беларускіх землях яшчэ ў XII стагоддзі, а спалучэнні бел-чырвона-белых колераў упадабалі тутэйшыя плямёны ў бронзавы і жалезны вякі. Дарэчы, Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 траўня 2007 года №578 герб "Пагоня" ўнесены ў Дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі.

***

У невялікім горадзе Ганцавічы, што на Брэстчыне, 3-4 верасня праходзіў XVIII Дзень беларускага пісьменства. У рамках яго адбылося шмат цікавых выстаў, канцэртаў, выступленняў і іншых імпрэз. У наступным нумары "Шыпшыны" будуць надрукаваны ўражанні ўдзельніка гэтага Свята беларускага слова.




***

Новы менскі Цэнтральны аўтавакзал, які будуюць з 2007 году і адкрыюць днямі, аформлены цалкам на расейскай мове ў адрозненне ад суседняга чыгуначнага вакзала, шыльды на якім беларускамоўныя. Папярэдні будынак Цэнтральнага аўтавакзала, пабудаваны ў 1962 годзе, таксама быў аформлены па-беларуску.

Калі пагадзіцца, што вакзалы – твар коаіны, то тут беларусам у гэты твар проста плюнулі. (з газеты "Наша слова" ад 14 верасня 2011 года)

# СОНЕЧНАЯ ВАНДРОЎКА

Апошнія выхадныя лета выдаліся цёплыя і сонечныя. Такое надвор’е –




ідэальны час для вандровак па родным краі. Гэтым і скарысталіся сябры раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы з Паставаў і Гуты. Усуботу-нядзелю яны здзейснілі краязнаўчую экспедыцыю ў ваколіцы Ляхаўшчыны, Навадруцка, Казлоўшчыны. За два дні ўдалося паглядзець і абследаваць шмат цікавых прыродных і гістарычных аб’ектаў, пагаварыць з многімі мясцовымі жыхарамі. У выніку гэтага ўдзельнікі вандроўкі сабралі легенды і гісторыі, звязаныя з цудадзейнай крыніцай “Грамякі” і вызначылі прычыны лекавых уласцівасцяў крынічнай вады, запісалі ўспаміны і сфатаграфавалі рэшткі былога



Двара Сарокі і старыя пахаванні на мясцовых могілках, агледзелі Сароцкае гарадзішча, абследавалі сядзібны комплекс у Казлоўшчыне, пабачылі помнікі Асінагарадка і Парыжа. Збор краязнаўчых матэрыялаў спалучаўся з хвілінамі адпачынку каля маляўнічых тамтэйшых азёр: Сароцкага, Крывага, Ласіцкага і ракі Ласіцы. Шмат станоўчых эмоцый атрымалі ўдзельнікі вандроўкі ад сумеснай дзейнасці і побыту. Панаванне ў размовах роднай беларускай мовы, вясёлыя жарты і кпіны, цікавыя гутаркі



*Царква ў Асінагарадку*




Шыпшына




на розныя тэмы – усё гэта ўзбагачала душы і сэрцы кожнага. Можна сказаць, што выхадныя дні – гэта свята, якое было з намі. Мы ўдзячныя людзям, якія трапляліся на нашым шляху, якія дапамагалі нам падказкамі і парадамі, дзяліліся з намі сваімі ўспамінамі. Асаблівая ўдзячнасць – адміністарцыі Казлоўшчынскай школы за арганізацыю начлега і настаўніку геаграфіі гэтай школы Міхаілу Мікалаевічу Мікулічу за дапамогу ў правядзенні экспедыцыі.

Таварыства беларускай мовы і надалей плануе ладзіць падобныя краязнаўчыя вандроўкі, у якіх могуць паўдзельнічаць усе, хто любіць беларускую мову і жадае на ёй размаўляць, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Пастаўшчыны, хто хоча знайсці сабе новых цікавых сяброў.

Для гэтага варта звязацца па тэлефоне 514-80-03 (Людміла).



*Гатаванне вячэры*



*Казлоўшчынская школа*

*Ігар Пракаповіч*

*Фота аўтара*

## ВЫХАВАННЕ АСОБЫ І ПАРЫЁТА БЕЛАРУСІ НА АСНОВЕ БЕЛАРУСКАСЦІ І ХРЫСЦІЯНСКІХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

Беларусь перажывае адзін з няпростых гістарычных перыядаў. І самая вялікая небяспека, якая падпільноўвае наша грамадства сёння, - не ў эканамічных праблемах, а ў разбурэнні асобы. Цяпер матэрыяльныя каштоўнасці дамінуюць над духоўнымі, таму многія людзі маюць скажонае разуменне справядлівасці і грамадзянскасці. Адной з галоўнай прычын бездухоўнасці, на мой погляд, з'яўляецца адсутнасць беларускасці і рэлігійнага складніка ў сістэме выхавання, што адбіваецца і на якасці ведаў, і на маральна-псіхалагічным клімаце школы і сям'і. У некаторых сучасных дзяцей няма ні працавітасці, ні цярпення, ні веры. Іх адрознівае эмацыйная, валявая і духоўная няспеласць. «А без зачаткаў свяшчэннага і прыгожага нельга пускаць чалавека ў жыццё»,- пісаў Ф.М. Дастаеўскі.

Выхаванне сапраўднага патрыёта магчыма толькі тады, калі дзеці вывучаюць Закон Божы і нацыянальную культуру, а заняткі праводзяцца па-беларуску. Духоўна-маральнае выхаванне фарміруе ядро асобы, жыватворна ўплываючы на ўсе формы ўзаемаадносін чалавека са светам: на яго этычнае і эстэтычнае развіццё, светапогляд і фарміраванне грамадзянскай пазіцыі, патрыятычную і сямейную арыентацыю, інтэлектуальны патэнцыял, эмацыйны стан і агульнае фізічнае і псіхічнае развіццё. Хрысціянская вера – гэта ўпэўненасць у тым, што Бог існуе. Але проста ведаць, разумець розумам, што Бог ёсць, гэтага мала для хрысціяніна. І нячысцікі вераць, гэта значыць ведаюць, што Бог ёсць, але пры гэтым не адыходзяць ад граху, таму ведаць - гэта мала, трэба давяраць Богу, давяраць Яго волі і, калі нас хваляць, і калі ганяць, і калі мы здаровыя, і калі здароўе нас пакідае, і калі нас любяць, кахаюць, і калі нас лаюць, ведаць, што Бог заўсёды з намі, больш таго, Ён нам не дасць выпрабаванні, якія мы не зможам вытрываць. Успомнім прыпавесць пра самы лёгкі крыж.

*Нёс чалавек свой крыж. Стаміўся. Прылёг адпачыць. І прысніўся яму Гасподзь. І звярнуўся чалавек да Бога, каб той даў яму лягчэйшы крыж. Праз некалькі хвілін убачыў чалавек вялікае мноства крыжоў перад сабой. Доўга выбіраў і прымяраў чалавек тыя крыжы. Нарэшце ўзяў самы зручны, які быў зроблены, як бы па мерцы для яго. А Гасподзь сказаў: "Ты выбраў свой крыж". Гэта быў той самы крыж, які чалавек дагэтуль нёс."*

Мы павінны вучыцца любіць. Любоў - паняцце надзвычай ёмістае і шматзначнае. Любоў - гэта не шчаслівая выпадковасць ці мімалётны эпізод. Яна патрабуе ад чалавека самаўдасканалення, самаадданасці, гатоўнасці да ўчынку і самаахвяраванню. Любоў - гэта актыўная зацікаўленасць у жыцці і развіцці таго, каго мы любім. Галоўнае - любіць самому. Успомнім лацінскую прыказку: «Калі жадаеш быць любімым - любі». Чалавек, які любіць, адчувае такую ж адказнасць за сваіх блізкіх, як і за самога сябе. Можна падзяліць любоў на некалькі відаў: братэрская, бацькоўская любоў, каханне паміж мужчынам і жанчынай, любоў да сябе, любоў да прыроды, да Айчыны і любоў да Бога. Любоў да Бога - аснова ўсіх відаў любові, здольных змясціцца ў чалавечай душы.

Веруючыя людзі становяцца шчодрымі. Для таго, хто сумленна верыць у жыццё будучага веку, прагнасць - пачуццё не проста грахоўнае, але і вельмі вар'яцкае. Колькі ні збірай багацце на зямлі, з сабою на неба не панясеш ні капейкі. Як гэта проста, і як часта людзі пра гэта забываюць. Святое Пісанне шмат разоў нагадвае нам пра тое, што зямныя скарбы толькі замінаюць чалавеку багацець душою. Ніводнай рэчы на зямлі

не трэба лічыць сваёю ўласнасцю. Усё дадзена нам Богам толькі на малы час, і мы павінны дзяліцца з бліжнімі. «Дай капейку і вазьмі Неба, не таму што яно таннае, а таму што Бог шчодры, Ён чакае і ад цябе шчодрасці,»- пісаў Іаан Златавуст. Як гэта проста і які вялікі кошт міластыні.

Трэба звяртаць увагу дзяцей на лепшае, бо не ўсе веды карысныя. Згадзіцеся, ёсць вельмі шкодная для душы інфармацыя. І трэба добра памятаць словы Хрыста пра тое, што мы часта бачым парушынку ў чужым воку, а ў сваім і бервяна не заўважаем. Мы часта паводзім сябе як мухі. *Мухі назавуць ўсе сметніцы, але калі вы спытаеце муху, дзе ў наваколлях растуць кветкі, яна не зможа вам адказаць. Пчала ж распавядзе вам пра пахучыя кветкі, якія растуць у акрузе, але яна не ведае, дзе смецце. Нават на квітнеючым лужку муха знойдзе бруднае месца і сядзе на яго. А пчолка ў самым смярдзючым балоце знойдзе кветачку і збярэ з яго нектар. Так і людзі. Адны, як мухі, ў кожнай сітуацыі вышукваюць штосьці дрэннае і займаюцца толькі гэтым. І ні ў чым яны не бачаць ні кроплі добрага. Тыя ж, хто падобны на пчалу, знаходзяць добрае ва ўсім.*

Трэба ведаць, што кожны талент не дадзены выпадкова і ён з'яўляецца заданнем. Не зрабіць нешта добрае, маючы магчымасці, гэта ня проста лянота, а злачынства. Плён павінны прынесці ў першую чаргу боскія цноты: вера, надзея і любоў, але таксама такія дабрадзейнасці, як цярплівасць, стрыманасць, лагоднасць, паслужлівасць, вернасць ды іншыя станоўчыя рысы. І калі мы шмат працуем не на сваю карысць, а на карысць іншых людзей, са светлымі намерамі, нашы прыродныя таленты і здольнасці памнажаюцца.

Незразумела, чаму так часта дарослыя пярэчаць вяртанню да сваіх асноў? І не конкурсы прыгажосці патрэбныя нашым дзецям, а рэлігійныя школы, майстэрні, гурткі, беларускія гістарычныя і краязнаўчыя клубы . Выхоўваць трэба маральнасць, сумленне, заснаваныя на хрысціянскіх традыцыях. І тады ў бізнэс і палітыку пойдуць людзі, сумленнасць для якіх норма, і не для таго, каб заняць месца для крадзяжу ці асабістага ўзбагачэння, а каб умацоўваць і ўзвышаць Радзіму. Людзі павінны знаходзіць устойлівыя маральныя арыенціры. Нельга стаць паўнавартасным грамадзянінам дзяржавы, не ведаючы, што дадзеныя Богам запаведзі «не забі», «не крадзі», «не пралюбадзейнічай» і іншыя абавязковыя для ўсіх, безадносна да таго, веруючы ты ці не.

Мэтазгодна вярнуць разбуранаы сэнс такіх светапоглядных катэгорый, як культура, адукацыя, выхаванне. З прац Глінскіх старцаў: «Неразумна паступаюць бацькі, навучаючы дзяцей розным навукам і замежным мовам, забываючы пра ўнутранае выхаванне», г.з. пра вучэнне Госпада. Трэба выхоўваць дзяцей жыць па-хрысціянску. «Ад добрага выхавання плады вынікаюць: 1) плён набожнага жыцця ў дзецях, 2) бацькам уцеха, 3) вечнага жыцця надзея, 4) гонар і хвала сям'і, 5) апора айчыне».

Бацькам, вядома, трэба быць узорам у паводзінах для дзяцей. «Бо больш дзеці глядзяць на жыццё бацькоў, чым словы іх слухаюць».

Многія бацькі проста не ведаюць, што менавіта ў сям'і адбываецца засваенне сацыяльных норм, маральных патрабаванняў і ўзораў паводзін на аснове пераймання. Таму неабходна дапамагчы бацькам усвядоміць, што ў першую чаргу ў сям'і павінны захоўвацца і перадавацца родная мова, маральныя і духоўныя звычаі і каштоўнасці, створаныя продкамі, і што менавіта бацькі адказныя за культуру дзяцей. Бо культура - гэта «культ» - глыбокая пашана святла і апрацоўка народнага духу. Бацькі павінны ведаць, што сапраўднае выхаванне немагчыма без выхавання рэлігійнага.

Успомнім словы Хрыста «Пусціце дзяцей прыходзіць да Мяне, бо такіх ёсць Царства Нябеснае".

*Наталля Пракаповіч*

# «ПАЭЗІЯ - ГОСЦЯ НЯБЕСНАЯ...»



**Арэх Мікалай Уладзіміравіч** нарадзіўся 09. 09. 1971 года ў вёсцы Жоўніца Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў гістарычны факультэт Магілёўскага ўніверсітэта. Працуе настаўнікам гісторыі ў Гуцкай сярэдняй школе Пастаўскага раёна.

Сфера інтарэсаў: гісторыя, краязнаўства, педагогіка. Збірае і апрацоўвае матэрыялы па Галбейшчыне. У сааўтарстве з І. Пракаповічам падрыхтаваў і выдаў кнігу "Гута-Голбія" пра вёску Гута і яе ваколіцы. Стварыў краязнаўчы музей у Гуцкай школе.

Цікавіцца літаратурай і паэзіяй, у хвіліны натхнення піша вершы.

Сёлетні год у Мікалая Уладзіміравіча юбілейны. Сябры з Таварыства беларускай мовы віншуюць яго з гэтай адметнай вяршыняй на жыццёвым шляху і жадаюць натхнення, поспехаў і новых яскравых вандровак і адкрыццяў.

## КАХАННЕ

*Вечар... Зоры... З прывітаннем*
*Крокам рушу на спатканне.*

*Пад высокаю ялінай*
*Сустракаюся з дзяўчынай.*
*Маніць стан яе дзявочы,*
*Крыху з сумам цёмны вочы.*
*Сэрца радасна трасецца*
*Вунь ідзе... Аж не... Здаецца...*
*Зноў імчаць уперад мары*
*Кроў бурліць, душа ў пажары.*
*Час цягучы вельмі моцна,*
*Думак рой – ўсё не памоцна.*

*Вечар.. Зоры...З прывітаннем*
*Бегчы хочу на спатканне.*

## КАЛІ БЫЎ У ХАРДАКОВЕ...

*Калі быў у Хардакове,*
*Бачыў помнікі ў полі.*
*Колісь там стаялі хаты...*
*Другі год вайны праклятай*
*Змарнаваў усе надзеі:*
*Двадцаць тры жыцці згарэлі.*
*Выжыў толькі тут Ананій:*
*З бацькам елкі рыхтавалі.*
*Завялі і іх ў хату,*
*Дзе стралялі аўтаматы.*
*Там скрываўлена дзяўчына*
*Лезла ўгору па драбіне.*
*Ратаваць жыццё хацела,*
*Але толькі не паспела.*
*Потым іх чарга настала,*
*Брата хутка смерць забрала.*
*Бацька ж здолеў - прытварыўся*
*Сын з раненнем пакаціўся.*
*Калі хата запылала,*
*Ратавацца можна стала.*
*Дыму слуп у лес ішоў,*
*Бацька з сынам у ім пайшоў.*
*Ззаду бег маленькі Беля,*
*Яго сёстры ўсе згарэлі.*
*Толькі Белю ўсё ж нагналі,*
*Галлё кінулі, сказалі:*
*"Прынясі. Дадзём цукерку".*
*Той жа ўзяў то на паверку.*
*Потым хлопчыка хавалі,*
*Ломам з рэчкі выбівалі.*
*... Калі быў Хардакове,*
*Бачыў помнікі ў полі.*

## КАБ ЦЯБЕ ЛІХА...

Ці здіўляецеся вы, калі чуеце, ідучы па вуліцы, лаянку? Адказ вядомы. Брудныя, зневажальныя словы, на жаль, сталі ў нашым грамадстве побытам і ўспрымаюцца як факт. Лаянка перастала быць і недрукаваным словам: моцнае слоўца прачытаеш у "літаратурных" творах, пачуеш у словах песень, у размовах актораў і тэлевядучых.

Звычайна, калі чалавек вымаўляе брудные словы, ён знаходзіцца ў моцным эмацыянальна-негатыўным настроі. Ён набліжацца да пекла. А гэта моцна ўплывае як на духоўны, так і на фізічны стан чалавека. Навукай даўно даказана, што вада здольная ўспрымаць, захоўваць і перадаваць інфармацыю. А калі прыгадаць, што наша цела на 80% складаецца з вады, то становіцца зразумелым адкуль у сучасных людзей столькі хваробаў, а дзеці такія кволыя. Калі вада ўспрымае, захоўвае і перадае інфармацыю, то чалавек, які лаецца наносіць шкоду не толькі сабе, але і сваім нашчадкам. Але, калі крыху паглыбіцца ў гісторыю, мы пабачым, што цяперашняя брудная лаянка не была ўласціва беларусам. Нашы продкі, бывала, таксама



*Лярва*




*Украінскі плакат*

ўжывалі нядобрыя выразы, лаянкі, але гэтыя словы ніколі адкрыта не ўказвалі на геніталіі чалавека. Беларуская мова, у тым ліку і лаянка, вельмі цнатлівая, а калі ругаліся, з'вярталіся да язычніцкіх багоў: Паляндра, Халера, Злыдзень, Лярва, Чур. "Каб ты запаляндраваў", "Чур табе на язык". Я не хачу сказаць, што гэта дабрыя словы. Яны таксама нясуць у сабе адмоўную энэргію....

Мова - гэта асобны светапогляд, сватаўспрыманне чалавекам навакольнага свету, яна адлюстроўвае характар народа. Беларусы славяцца з аднаго баку сваёй добразычлівасцю, працавітасцю, сціпласцю, гасціннасцю, з другога - баязлівасцю, прыстасаванасцю, найвялікшай цярплівасцю. І ніколі - злосццю, раз'юшанасцю. Тое тычыцца і лаянкі. Калі чалавек, у якога вось-вось сарвецца з вуснаў моцнае слова, так званы "рускі мат", паспрабуе замяніць яго беларускай лаянкай, гэта выкліча ўсмешку. А дзе ёсць усмешка, няма злосці. І гэта яшчэ адзін важкі аргумент дзеля таго, каб мы вярталіся да сваёй мовы, да уласцівай ёй дабрыні і спагады.

*Людміла Сяменас*



**Шыпшына**
*Выданне Пастаўскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны*

Адказны за нумар: Ігар Пракаповіч

Адрас: 211875, горад Паставы, вул. Паркавая, 52. Тэл.: 02155-4-44-75

Вёрстка: Ігар Пракаповіч

*Рэдакцыя можа не падзяляць думкі аўтараў друкаваных матэрыялаў*

*Надрукавана на абсталяванні сяброў, распаўсюджваецца дарма*

*Наклад 100 асобнікаў*